**В. М. Сідаровіч**
*Мінск, Беларусь*

# СКАРБ РЫМСКІХ ДЭНАРЫЯЎ З-ПАД в. БАЧАНЦЫ ВАЎКАВЫСКАГА РАЁНА

У 2011 г. каля вёскі Бачанцы, што размешчана прыкладна за 1,5–2 км. на поўдзень ад г. Ваўкавыск Гродзенскай вобласці, быў знойдзены невялікі скарб срэбных манет Рымскай імперыі. У ягоны склад уваходзяць 13 дэнарыяў.

Самай ранняй манетай дэпазіта з'яўляецца дэнарый Траяна, адчаканены ў Рыме ў 103–111 гг. (RIC 108). Пяць дэнарыяў адчаканены ў час праўлення Антаніна Пія (138–161) – адзін з выявай самога імператара (RIC 202b або 218), тры з выявай Фаўсціны Старэйшай (пасмяротная чаканка, RIC 361, RIC? і RIC?) і адзін з профілем Фаўсціны Малодшай (RIC 496). Да эмісій часу Марка Аўрэлія (161–180) належаць 4 манеты: дэнарый, біты ў памяць Антаніна Пія (RIC 438), і па аднаму дэнарыю з партрэтамі Фаўсціны Малодшай (RIC?), Люцыя Вера (RIC 491) і Каммода (RIC 601). Да чаканкі самога Каммода належаць 2 манеты з яго ўласнымі выявамі (RIC 175, RIC 192).

Нарэшце, малодшай манетай дэпазіта, якая вызначае *tpq* скарба, з'яўляецца дэнарый Пертынакса (RIC 4A), адчаканены ў студзені – сакавіку 193 г. Манета гэтага імператара, які знаходзіўся ва ўладзе менш за 3 месяцы, упершыню зарэгістравана на тэрыторыі Беларусі.

Невялікі скарб з-пад в. Бачанцы – яшчэ адзін з дэпазітаў рымскіх манет з захаду Гродзеншчыны (Шталенков, 2017. С. 67–68; Белявец, Сідаровіч, 2018), культурна-храналагічная прыналежнасць якіх пакуль застаецца нявызначанай з-за слабой археалагічнай даследаванасці помнікаў жалезнага веку гэтага рэгіёну. Пакуль можна толькі меркаваць, што гэтыя скарбы належалі ўсходнегерманскаму (гоцкаму?) насельніцтву, якое магло пранікаць у гэтую частку Панямоння ў III–V стст.

## Спіс літаратуры

*Шталенков И*. Новые находки античных монет в Беларуси // Банкаўскі веснік, 2017, № 2 [643]. С. 67–71.

*Белявец В., Сідаровіч В*. Алекшыцкі манетна-рэчавы скарб эпохі Вялікага перасялення народаў // Банкаўскі веснік, 2018, № 2 [655]. С. 3–16.



This document has been edited with Infix PDF Editor - free for non-commercial use.
To remove this notice, visit: www.iceni.com/unlock.htm